ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

10 кастрычніка 1931 г.
№ 23[illegible] (1504)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

XIV гадавіну сустрэць падрыхтаванымі

Набліжаецца 14 гадавіна Кастрычнікавай рэволюцыі. Праз некальткі тыдняў пролетарыят Савецкага Саюзу разам з пролетарыятам усяго сьвету будзе сьвяткаваць вялікую ўрачыстасьць пролетарскай рэволюцыі.

14 год Кастрычнікавай рэволюцыі—гэта 14 год упартай барацьбы пролетарыяту Савецкага Саюзу сумесна з асноўнымі масамі сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за дыктатуру пролетарыяту, за новы соцыялістычны лад. Гэта 14 год барацьбы пачынаючы з грамадзянскай вайны праз пэрыод аднаўленьня да пэрыоду соцыялістычнай рэконструкцыі. Гэта час, калі разбураная на працягу 7 год вайны краіна аднавіла сваю гаспадарку і перайшла на рэйкі рэконструкцыі і стварэньня соцыялістычнай грамады з вышэйшай навукай і тэхнікай.

14 год пролетарскай рэволюцыі ў Савецкім Саюзе—гэта 14 год вялікіх рухаў, вялікіх рэволюцыйных падзей.

14 гадавіна Кастрычнікавай рэволюцыі ў Савецкім Саюзе будзе адзначана яшчэ больш упартай барацьбой за выкананьне бальшавіцкіх пляпаў, за сваячасовы пуск усіх 518 і 1040, барацьбы за рэалізацыю шасьці ўказаньняў Сталіна і організаваную сустрэчу чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. Сьвяткаваньне 14 гадавіны будзе адзначана новым масавым прылівам у колгасы і замацаваньнем старых колгасаў, барацьбой за выкананьне ўсіх гаспадарчых задач сёньнешняга дня.

У капіталістычных краінах гэта сьвята будзе праходзіць пры ўмоўмовах жорсткага тэрору. Сотні і тысячы беспрацоўных выйдуць на вуліцу ў знак солідарнасьці з Савецкім Саюзам і яго барацьбой за соцыялізм. Бо толькі Савецкі Саюз—краіна, якая ліквідавала беспрацоўе, бо толькі Савецкі Саюз ня ведае крызісу.

Перад комсамолам Беларусі ў справе падрыхтоўкі да сьвяткаваньня гэтай гадавіны паўстаюць вялікія і адказныя задачы. Комсамол Беларусі павінен дабіцца да гэтага часу давядзеньня сталінскай пуцёўкі да кожнага комсамольца і маладога рабочага, павінен разгарнуць работу па стварэньню новых дзесяткаў і соцень ударных гаспадарча-разрахунковых брыгад імя 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

Гэта гадавіна павінна быць адзначана новымі чырвонымі абозамі хлеба, ударнымі комсамольскімі эшалёнамі бульбы, поўным выкананьнем усіх народна-гаспадарчых задач гэтага часу. Перад комсамолам транспорту стаіць задача: змагацца за лепшую пастаноўку паравознага парку. Комсамол лесасплаву і лесанарыхтовак павінен дабіцца ў бліжэйшы час выкананьня пляну лесанарыхтовак і вывазкі.

14 гадавіна павінна быць адзначана ўзмацненьнем інтэрнацыянальнай сувязі з комсамолам Захаду і Ўсходу, дапамогай замежнаму комсамолу ў яго барацьбе.

Адначасова з гэтым, неабходна, каб маладое падрастаючае пакаленьне, комсамольскі маладняк вывучаў гісторыю вялікага Кастрычніка, і гісторыю папярэдняга слаўнага традыцыямі комуністычнай партыі пэрыоду з тым, каб, вывучаючы гісторыю мінулага, мацаваць свае рады вакол партыі Леніна для барацьбы за ленінскую генэральную лінію партыі.

ЗАВОД БЕЗ МАТОРА--НЕ ЗАВОД

Белільнаканоплябуд не дасылае мантажных частак падшэфным ільназаводам

Мантаж не павінен быць вузкім месцам у пуску заводаў

Белільнаканоплябудбуд павінен забясьпечыць сваячасовую дасылку машын, каб не стварылася ніякага перапынку паміж сканчэньнем будаўніцтва корпусу і мантажам.

Установку і мантаж машын і інш, частак можна і трэба праводзіць роўналежна з заканчэньнем будаўніцтва асноўных карпусоў.

Комсамольская організацыя, як шэф будаўніцтва ільнозаводаў, павінна забясьпечыць пасьпяховы ход мантажных работ і пуск ільнозаводаў.

Корпус чакае мантажу

Бігосаўскі завод быў намечаны к пуску да 1-га верасьня. Будынкі для мантажу трэ' было падрыхтаваць не пазьней 15-га жніўня. Будаўнікі ільназаводу далі абяцаньне гэтыя тэрміны выканаць, У выніку ўдарнай работы вытворчы корпус ільназаводу амаль скончаны

Самае галоўнае зараз—мантаж. Аднак, ні аднае часткі машыны яшчэ ня прыбыла. Белільнаканоплябудбуд аб гэтых не клапоціцца і затрымлівае пуск ільназаводу тэрмін.

Мы патрабуем ад вышэйшых будаўнічых організацый зараз-жа высланць часткі для мантажу.

Папінеўскі М.

Чавускі ільназавод павінен поўнасьцю аслабаніцца ад прарываў

Над будаўніцтвам Чавускага ільназаводу комсамольская раённая організацыя ўзяла шэфства. Ролю шэфа комсамол апраўдаў. У час прарыву на ільназаводзе ўдарныя брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі дапамаглі наладзіць працу.

На заводзе організавана комсамольская ячэйка. Ужо 2 разы ячэйка рабіла ў райкоме комсамолу справаздачу аб працы на будаўніцтве. Аднак перашкод яшчэ шмат.

Райколгассаюз тармозіць забясьпечаньне заводу рабочаю сілай. Многія колгасы ня вылучылі патрэбнай колькасьці рабочых.

Вучлеспрамгас зрывае забясьпечаньне будаўніцтва лесаматар'яламі Не гледзячы на неаднакротныя пастановы РайКК РСІ, рабочыя будаўніцтва не забясьпечаны харчамі.

Райпрафсавет зусім забыўся, што ў раёне будуецца ільнававод. Профработы сярод рабочых ангякай. Нават профупаўнаважанага на заводзе няма.

Комсамольская організацыя, узяўшы шэфства над ільназаводам, павінна дапамагчы ня толькі фізычнай працай, але штодзенна ліквідуючы перашкоды і рагаткі на шляху пасьпяховага заканчэньня і пуску ільназаводу.

Не зацягнуць апрацоўку ільнавалакна

Бабруйск 8. Першапачатковая апрацоўка лёну, мочка і расьсьцілка колгасамі Бабруйскага раёну праводзіцца нездавальняюча. Не 5-е кастрычніка абмалочана лёну 98,8 проц., намочана 44 проц., выслана 30,2 проц. Па зьвестках з 23 колгасаў, паднята 90 га трасты, што складае 25 проц. да агульнай колькасьці абмалочанага і ўбранага лёну.

Аднаасобны сэктар поўнасьцю скончыў абмалот, мочку і расьціл. Паднята 627 га трасты. Большасьць колгасаў раёну не разгарнулі як належыць працу па сваячасовай апрацоўцы лёну. Не мобілізавана колгасная маса навокал гэтай важнейшай работы.

Напярэдадні кастрычнікаўскага пленуму Цк КП(б)Б

БАЛЬШАВІЦКІМІ СПРАВАМІ РАПАРТАВАЦЬ БАЛЬШАВІЦКАМУ ШТАБУ

Пастанова сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 3-га кастрычніка 1931 г.

ЦК лічыць, што комсамольская організацыя Беларусі павінны па-баявому правесьці падрыхтоўку да пленуму ЦК КП(б)Б. Радам конкрэтных дзеяньняў па ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, у прыватнасьці ў рэконструкцыі транспорту і разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі, паказаць, што комсамол змагаўся, змагаецца і будзе змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады і гэтым самым давесьці, што комсамол ёсьць самы лепшы, самы блізкі і адданы дапаможнік нашай ленінскай партыі.

Выходзячы з гэтага ЦК ЛКСМБ—пастанаўляе:

У галіне транспорту: 1. На грунце далейшага ажыцьцяўленьня пастаноў чэрвеньскага пленума ЦК Усе КП(б) аб рэконструкцыі транспорту дабіцца на справе баявога правядзеньня асеньня-зімовых перавозак, паставіўшы конкрэтнай задачай поўнае выкананьне усіх вымернікаў і асабліва давядзеньне процанту хворых паравозаў да устаноўленых норм. Павесьці рашучую барацьбу з усялякімі зрывамі спорнай язды.

2. Дабіцца палепшаньня працы існуючых комсамольскіх паравозаў. Асаблівую увагу аддаць догляду за паравозам, выкананьню і перавыкананьню нормы прабегу, экономіі апалу. Адначасова паставіць конкрэтную задачу: кожнаму колектыву ячэйкі цягі організаваць ня менш аднаго комсамольскага паравоза к пленуму ЦК.

3. КСМ організацыі к пленуму ЦК КП(б)Б дабіцца канчатковага пераводу ўсіх зьвеньняў чыгункі на гаспадарчы разрахунак. У першую чаргу дабівацца прыкладнасьці работы маладзёжна-гаспадарча-разрахунковых брыгад.

4. На працягу кастрычніка месяца правесьці масавую самаправерку стану ўдарніцтва, пад лёзунгам выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ. Павесьці рашучую барацьбу з ілжэ-ўдарніцтвам і парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. пад лёзунгам 100 проц. ахопу ўдарніцтвам усіх комсамольцаў і рабочай моладзі, організуючы спэцыяльныя брыгады, прысьвечаныя пленуму ЦК КП(б)Б.

5. Ухваліць ініцыятыву газэты „Чырвоная Зьмена" аб організацыі ў час праверкі радыё-пераклічкі па пытаньню ходу асеньня-зімовых перавозак і ўдзелу ў іх комсамольскай організацыі.

Прапанаваць усім ГК і РК забясьпечыць колектыўнае слуханьне ўсёй організацыяй у клюбах і чырвоных кутках. Абавязаць Віцебскі і Гомельскі ГК, Аршанскі, Магілеўскі, Жлобінскі, Полацкі і Асіпавіцкі РК забясьпечыць удзел гэтых організацый у радыё-пераклічцы.

6. Уся падрыхтоўчая работа к пленуму ЦК павінна праходзіць над лёзунгам поўнага выкананьня 6-ці ўказаньняў тав. Сталіна. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на разгортваньне культурна-масавай работы, аўладаньне тэхнікай, на ліквідацыю ўраўнілаўкі па ўсіх галінах, асабліва на службе шляху.

7. К пленуму ЦК КП(б)Б на грунце пастаноў ЦК ЛКСМБ скончыць перабудову ўсёй комсамольскай работы.

У галіне жывёлагадоўлі:

1. Да пленуму ЦК дабіцца сканчэньня будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. РК КСМ забясьпечыць актыўны ўдзел організацыі ў выкананьні гэтых задач, шляхам пасылкі комсамольцаў на будаўнічыя работы расстаноўкі рабочай сілы, разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, пераводу на зьдзельшчыну, ліквідацыі ўраўнілаўкі. На ўсіх будаўнічых работах КСМ—організацыя павінна дабіцца організацыі маладзёжных ударных брыгад імя пленуму ЦК КП(б)Б.

2. К пленуму ЦК КП(б)Б комсамольскія організацыі павінны забясьпечыць актыўны ўдзел у комплектаваньні стада, праводзячы адпаведную работу сярод індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па загатоўцы заводзкай жывёлы для колгасаў, за поўнае захаваньне маладняка ў колгасах.

3. Комсамольскім ячэйкам саўгасаў „Сьвінавода" і колгасна-сьвінаводчых фэрм дабіцца поўнага зьнішчэньня процанту падзяжу шляхам ужываньня зоовэтмінімуму. На справе дабіцца „тоны мяса з шасьцімесячнага апаросу".

4. РК і ячэйкам к пленуму ЦК КП(б)Б організаваць рад комсамольскіх сьвінарнікаў. Дабіцца прыкладнай работы сьвінарнікаў. Правесьці адпаведную работу па забясьпечаньню кармовай базы.

5. ЦК указвае ўсім організацыям аб неабходнасьці баявой падрыхтоўкі к пленуму ЦК КП(б)Б, мобілізацыі ўсіх зьвеньняў організацыі, рабоча-колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі на пасьпяховае выкананьне чарговых задач партыі з тым, каб кожная організацыя змагла-б конкрэтнымі лічбамі перамог рапартаваць пленуму ЦК КП(б)Б.

6. Усім РК, колектывам і ячэйкам ЛКСМБ прапрацаваць гэтае рашэньне ЦК ЛКСМБ і вызначыць рад практычных мерапрыемстваў па правядзеньню баявой падрыхтоўкі к пленуму ЦК КП(б)Б.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Гуткін.

Уздымаецца новая хваля барацьбы польскага сялянства

Ад стыхійных выступленьняў да організаванай барацьбы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі

Організаванае супраціўленьне

Сяляне з вёскі Л. пішуць: „зьявіліся да нас у вёску 4 паліцыянты і 3 шпікі, каб арыштаваць 2 сялянскіх хлапцоў за падазронасьць у прыналежнасьці да комсамолу і „антыдзяржаўнай дзейнасьці".

Маладыя хлопцы карысталіся ў вёсцы вялікім аўторытэтам і пашанай. Таму прыезд „непрошаных гасьцей" устрывожыў усю вёску. Сяляне, асабліва моладзь і жанчыны, у некалькі хвілін сабраліся каля хаты, дзе праводзілася рэвізія каб не дапусьціць арышту. Яны ўвайшлі ў хату і выгналі вон паліцыянтаў, якіх добра патурбавалі.

Сяляне закінуліся ў хаце і не адчынялі дзьвераў.

Праз нейкі час у вёску прыехалі два грузавікі пешай і атрад коннай паліцыі. Сяляне вёскі загарадзілі ім бярвеньнямі дарогу да хаты і кідалі ў іх камяньні.

Паліцыянты прыкладамі прачысьцілі дарогу і ўварваліся ў хату, праламіўшы дзьверы, але былі сустрэчаны камнямі і паленьнямі дроў.

З вялікай цяжкасьцю паліцыі ўдалося арыштаваць двух хлапцоў і яшчэ 4 жанчыны.

(„Зьвязда")

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Адзін мільён 300 тыс. на вайсковыя расходы

ТОКІЁ, 8. Японскі ўрад асігнаваў адзін мільён 300 тысяч іён з запаснога фонду на расходы па ўтрыманьню войскаў у сувязі з манджурскімі падзеямі.

Рыхтуюцца перамовы

ТОКІЁ, 8. Па паведамленьню „Асахі" вайсковая ўлада гатова прыступіць да абмену думкамі з міністрам па замежным справам аб прынцыпах далейшай палітыкі японскага ўраду ў прадстаячых перамовах у Кітаі.

Джорж Хікс, які ўпэўнена казаў аб перамозе лейборысцкай партыі на выбарах, падкрэсьліў, што партыя зможа атрымаць перамогу толькі ў тым выпадку, калі яна здолее пераканаць масы ў тым, што „лейборысцкі ўрад думае сапраўды зьдзейсьніць програму соцыялізму, а не супрацоўніцтва з капіталізмам".

(З газэт).



БЕЗ ДАКЛАДНАГА УЛІКУ ПРАЦАДЗЁН НЕЛЬГА ДАБІЦЬ УРАУНІЛАУКУ

Укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх работах. Шырэй разгарнуць падрыхтоўку да разьмеркаваньня прыбытку

Разьмеркаваньне прыбыткаў у колгасах па колькасьці і якасьці затрачанай працы, організацыя работы на аснове зьдзельшчыны—гэта магутныя вагары барацьбы за ўмацаваньне колгаснай вытворчасьці і за высокую прадукцыйнасьць.

Разьмеркаваньне прыбытку па прынцыпу „хто больш і лепш працуе, той больш атрымае—хто не працуе, той нічога не атрымае“ мы нанясем руйнуючы ўдар кулацкай ўраўнілаўцы і гультаём.

Комсамольская ячэйка павінна быць актыўным барацьбітом за правільнае разьмеркаваньне прыбытку на аснове ўліку колькасьці працы кожнага колгасьніка. Комсамольскія ячэйкі колгасу павінны зараз-жа прыступіць да падліку працадзён кожнага колгасьніка з тым, каб к 1-му студзеня 1932 г. поўнасьцю скончыць разьмеркаваньне прыбытку. Шырока давесьці да кожнага колгасьніка аб парадку разьмеркаваньня прыбыткаў колгасу.

Працадзень замяняюць „палачкай“

Колгас „Чырвоны пуцілавец“ (Тураўскі раён, Верасьніцкі с-с) яшчэ не правёў працу на зьдзельшчыну. Брыгадзіры, замест вымерваць вучасткі, правяраць зробленую працу, прыходзяць у канцылярыю і адзначаюць „палачкамі“ працу колгасьнікаў.

У выніку вытворчасьць працы колгасу дрэнная. Уборачная кампанія яшчэ не закончана. Сенажаць ня скошана. Плян асеньняй сяўбы ня выканан. Ня ўсе колгасьнікі скарыстоўваюцца на працы. 30 чалавек зусім не працуе ў колгасе. Ніякай барацьбы з прагульшчыкамі і сымулянтамі не вядзецца.

Да разьмеркаваньня прыбыткаў у колгасе не прыступілі.

Райколгассаюз павінен забясьпечыць кіраўніцтвам колгас „Чырвоны пуцілавец“.

М. Горкі.



Ударная брыгада на ўборцы бульбы

Займаюцца толькі гаварыльняй

Колгас „Сталінец“ Капыльскага раёну ігнаруе зьдзельшчыну. Не карыстаўся ёю ні ў час васновае сяўбы ні ў час уборачнай кампаніі, Прагульшчыкі і сымулянты разбураюць гаспадарку.

Комсамольская ячэйка ніякіх мер для гаспадарча - організацыйнага ўмацаваньня колгасу ня прымае. Сэкратар ячэйкі Пупейка Алесь, ён-жа рэдактар насьценнай газэты, займаецца толькі гаварыльняй аб зьдзельшчыне.

Райком комсамолу павінен прыцягнуць такіх да адказнасьці з тым каб комсамольская ячэйка стала сапраўдным ініцыятарам у барацьбе за гаспадарча-організацыйнае ўмацаваньне колгасаў.

Салагуб і Комсамолец.

Для разьмеркаваньня прыбыткаў чакаюць спэцыялістых

У колгасе „Чырвоная зорка“, Любаньскага раёну, дысцыпліна сярод колгасьнікаў пастаўлена зусім слаба. Ня ўсе колгасьнікі выходзяць своечасова на працу. Некаторыя пачынаюць працу а 11-12 гадзін дня. Уборка грэчкі з-за гэтага зацягнулася. 13 га зямлі яшчэ не ўзарана пад зяб.

Вулік працы вельмі дрэнна наладжаны. Працоўныя кніжкі колгасьнікам раздадзены, але запіс працадзён праводзіцца раз у 2 месяцы.

Падрыхтоўка да разьмеркаваньня прыбыткаў паміж колгасьнікамі не пачалася. Старшыня колгасу Ганчароў заяўляе: „Трэба чакаць спэцыялістых з раёну, а то мы самы наробім памылак“. Колгасьнікі не ведаюць, калі гэта разьмеркаваньне пачнецца. Вось чаму ўпала працоўная дысцыпліна.

Партыйна-комсамольская ячэйка таксама гаспадарчай працаю колгасу не займаецца.

Не чакаючы пакуль нехта прыедзе з раёну трэба ўзяцца за поўны падлік працы і разьмеркаваньне прыбыткаў.

Партыйцы і комсамольцы павінны стаць на чале гаспадарча-організацыйнага ўмацаваньня колгасу.

Вярэўка.

ДА 14 ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА—400 СТАНДАРТНЫХ КВАТЭР УДАРНІКАМ

Да ўсіх комсамольцаў чырвонасьцяжнага заводу „Комунар“ ад комсамольскай ячэйкі заводу №1 БВК

Палепшаньне бытавых умоў рабочай клясы пастаўлена зараз як адна з галоўнейшых задач.

Практычна ажыцьцяўляючы яе, ўрад БССР даручыў нашаму заводу да сьвяткаваньня 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі пабудаваць для рабочых Менску 400 стандартных кватэр.

Мы мобілізавалі ўсю нашу грамадзкасьць, увесь творчы энтузіязм рабочых на ажыцьцяўленьне гэтага даручэньня, як практычнага мерапрыемства па рэалізацыі гістарычнай прамовы тав. Сталіна.

Аднак зараз выкананьне пляну знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Адна з галоўнейшых прычын гэтага — невыкананьне вашым заводам нашых заказаў.

Так, па заказу № 2720 вы павінны былі да 15 верасьня выпрацаваць для нас: а) шпіндэль, б) даўбёжны варштат (амэрыканскі патрон), в) цыркулярку, г) фрэзерны варштат ад гэвтарэзкі (пераконструяваны).

Гэты заказ вашым заводам да гэтага часу ня выканан.

Мы лічым, што палепшаньне быту рабочых зьяўляецца справай усяго комсамолу, і таму звачаемся да вас, трымаючых ганаровы сьцяг ЦК ЛКСМБ:

Організуйце комсамольскі кантроль і дапамогу ў выкананьні нашага заказу ў бліжэйшыя дні;

Дапамажэце нам пабудаваць 400 стандартных кватэр для рабочых-ударнікаў чырвонай сталіцы Беларусі.

Мы чакаем практычных мерапрыемстваў па гэтаму пытаньню.

Па дарученьні бюро ячэйкі ЛКСМБ сэкратар ячэйкі Д. Фрыд.

Да першай гарадзкой конфэрэнцыі пляново-опэрацыйных груп

11-Х—31 г. скліваецца першая агульна-гарадзкая конфэрэнцыя пляново-опэрацыйных груп г. Менску. Гэта конфэрэнцыя разьбярэ асноўныя два пытаньні, якія стаяць зараз перад усім комсамолам: першае—ўключыць усю грамадзкасьць, кожнага ўдарніка і асабліва кожнага комсамольца ў складаньне сустрэчнага пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі і, другое інструкцыйны даклад аб працы пляново-опэрацыйных груп.

Гарком на сваім пасяджэньні бюро астанавіў організаваць сіламі комсамольскай організацыі гораду ва ўсіх цэхах прадпрыемстваў гораду пляново-опэрацыйныя групы. Гэта першая конфэрэнцыя павінна яшчэ больш зблізіць комсамольскую організацыю з спэцыялістымі-плянавікамі, з плянавымі аддзеламі ўсіх прадпрыемстваў. Конфэрэнцыя павінна падагуліць, як выканана пастанова гаркому аб організацыі пляново-опэрацыйных груп у кожным цэху.

Загадчык масава-вытворчым аддзелам Менгаркому ЛКСМБ Хэйман.

Усім колектывам і ячэйкам ЛКСМБ г. Менску

Заўтра, 11 кастрычніка а 7 гад. увеч. у доме навукі і тэхнікі скліваецца першая агульна-гарадзкая конфэрэнцыя пляново-опэрацыйных груп г. Менску з наступным парадкам дня:

1. Даклад тав. Бондара—плян 1932 году;
2. Работа пляново опэрацыйных груп на прадпрыемстве, у цэху і брыгадзе;
3. Рознае.

На конфэрэнцыю запрашаюцца: экономістыя плянавікі, працаўнікі плянавых аддзелаў прадпрыемстваў, спэцыялістыя і працаўнікі Дзярж пляну, НДІ, ВСНГБ.

Менгарком ЛКСМБ.

20-га кастрычніка—дзень праправерцоўкі сталінскай пуцёўкі

Пастанова сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 9-X—31 г. аб правядзеньні ўсебеларускага дня праправерцоўкі сталінскай пуцёўкі

Абвясьціць 20-га кастрычніка ўсебеларускім днём праправерцоўкі ва ўсёй сыстэме політвучобы „Комсамольскай сталінскай пуцёўкі“ 4-га, заключнага году 5-цігодкі, складзеных паміж ЦСПСБ і 3-ходняй областью соц. дагавароў на лепшую праправерцоўку сустрэчнага 4-га году 5-цігодкі і пастановы ЦК ЛКСМБ ад 23—IX аб удзеле комсамольскай організацыі ў рэалізацыі соц. дагавору паміж ЦСПСБ і Заходняй областью.

Я. Зазека

ПЕРАКАНАУСЯ

(Урывак з аповесьці „Клін„)

Прайшло некалькі месяцаў...

Ночы прыкметна кралі даўжыню дня. Сонца ўсходзіла блізка поўдня, паўзло вяла па краі неба і хутка заходзіла.

Цэлымі днямі тупаліся па кустох туманы, а з поля несла пахам прэлага бульбяніка.

„Дзяржынцы“ да гэтага часу скончылі ўборку. Засталося толькі дні на 2-3 работы, каб пераараць бульбянішча і змалаціць насевную канюшыну.

Вечоркамі муціліся змрокі ў канцылярыі колгасу. Зьбіраліся колгасьнікі, гутарылі пра гаспадарчыя справы.

— Калі нас угаварвалі ў колгас дык казалі, роўнымі будзем. Але зараз, хвароба у бок, галату напасталяюць. Сьвірыдаў робіцца панам Ён увесь колгас агарлаў, а нам скульля. Няма, мужчынкі, праўды! Ён 280 рублёў палучыць, а я 38. Дзе праўда?... —Стукаючы кулакамі па стале, спрачаўся і крычаў Пятроўскі.

Пятроўскага добра ведалі колгасьнікі, дык ніхто яму асабліва ня пярэчыў. Наадварот—маўчалі, і, сьмяяліся. Але калі ўжо ён занадта назаляў сваім крыкам, тады кідалі яму адно: —„Пеў летам, у хлявку лежачы—сьпявай узімку не еўшы!“. Пятроўскі ад гэтага сьціхаў. Ён хутка па ынаў шукаць слоў для адказу, і ніяк не знаходзіў, бо баяўся, што з яго яшчэ больш пачнуць строіць кпінкі і сьмешкі.

Раз увечары прышоўшы з колгасу Пятроўскі сеў каля камінку і пачаў адну за аднэю разблытваць пра сябе думкі. Асабліва ўспамінаўся сход колгасны, на якім разьмяркоўвалі прыбытак працадні. Як было сорамна, калі Мірон зачытаў што ў яго 24 працоўныя дні.

— Давялі абармоты,—засела і гняла адна і тая ж думка. Раптам цяжар навальваўся на яго. ціснуў да лаўкі і не даваў магчымасьці варушыцца здаровым рукам і нагам.

— Вось жысьць, пяруном бы яна пайшла! У печы скора выгарыць, а тут не дадумаешся, што ставіць. Бульба і бульба... Ужо кішкі праела,—пачала жонка.—Яшчэ да колгасу лык туды-сюды, а зараз ляжыць да [illegible] дня лежабок!

— Сьціхні! А то скора рот зачыню Што-ж, у гэтым я вінават? Здаецца пакуль ня ведалі абармотаў, усяго было.—Пятроўскі рэзка павярнуў галаву і кінуў на жонку вострым поглядам.

Яна ведала, што пачынаецца пасьля такой рэзкай размовы, а таму сьціхла, выцершы фартушком вочы. Затоеная пакута выразна малявалася на твары.

* * *

— Вось гэты палетак увесь за сеялі канюшынай Калі ўродзіць, на лета пэўна хопіць корму з нашай жывёлы,—ідучы праз поле, тлумачыў жончынаму брату Ўлас.

—А там на вошта вы абгарадзілі? зацікавіўся сваяк.

— Буракі сеяць будзем.

На полі?

Ды не, раней Манцэвіч канопляны боб сеяў тут, а зараз мы гарод зрабілі.

— А Манцэвіч дзе?—пачакаўшы запытаў сваяк?

— Ці ты яго ня ведаў?

— А як-жа, купляць салому прыяжджалі.

— Выслалі, шкодзіць шэльма стаў у самы гарачы час. Калі сеялі жыта. ён з Сакалоўскім укралі чацьвёра лепшых коняй, завялі ў лясі і падушылі. А коні былі, коні!...—уздых уўшы нібы зморана, пахмурна апавядаў Улас сваяку. Але мы яго, каб не міліцыянэр, жывога на кускі пэрвалі-б з злосьцю дадаў ён.

Сваяк зірнуў проста ў твар Уласу і насупіўшыся, сказаў.

— А вам шкада было, ці што? Ня было-б чым рабіць—казна дала-б другіх.

Улас уздрыгнуўся, нібы спалоханы.

Не, брат, калі-б мы так рабілі, дык старцамі пашлі-б. І я так думаў, калі ішоў у колгас.

Падыходзілі да колгасу. Падкраўшыся к берагу хмары, сыпнула сонца жменяй праменьняў. Уласавы грудзі дыхалі лёгка і павольна, набіраючы жыцьцёвай прагнасьці.

— А ў вас збожжа ўжо дзялілі?—зьвярнуўся да Уласа сваяк.

— Дзялілі.

— Многа вышла на душу?

— У нас, бачыш, зьдзельшчына. Кожная брыгада трымоўвала ад праўленьня нарад на якую-небудзь аботу і выконвала яе, потым брыгадзір пісаў, хто і скокі працаваў. А вось нядаўна праўленьне падлічыла даход. Адлічылі ў розныя фонды, рэшту падзялілі на працадні.

І колькі-ж вышла?—усьміхнуўся сваяк.

— Сколькі адпрацаваў працадзён, а за працадзень вышла па рублю і пяцьдзесят восем капеек, тлумачыў Улас. Адчуваласяі што ён укладаў у гутарку усю шчырасьць сваіх пачуцьцяў, каб давесьці падрабязнасьці сваяку.

Калі сёньня сход завідна скончыцца, дык сам паглядзіш як мы жывём.

Улас змоўк, але вочы працягвалі гаворку сваёй яснатою.

* * *

У памяшканьні, толькі што адрамантаваным пад клюб, было холадна. Колгасьнікі зьбіраліся, тупалі, не ахвотна садзіліся на лаўкі.

— Гэта што вучылішча?—увайшоўшы, аглядваўся сваяк.

— Ды не, клюб і чытальню адбудавалі.

У хуткім часе прышоў Мірон, а за ім цягнуўся цэлы натоўп.

— Вось і наш старшыня прышоў,—паказаў на Мірона Улас.

— Пачынай, брат! Ды толькі скора, а то ад холаду бярозавік з носу цячэ—сыпаліся жарты.

— Сядайце. Доўга не зацягнем,—супакойваў Мірон.

Так яно і было. Хутка абралі прэзыдыум. Старшыня адчыніў сход.

— Толькі супакойцеся. Пытаньне ў нас адно. Аб ім вы ўжо ведаеце.

— Прэмя вызначыць ударнікам,—крычаў нехта.

— Вось аб прэміі я і хачу сказаць,—пачаў з гэтага Улас.

— На мінулым сходзе праўленьню даручана было разьмеркаваць прэміі паміж лепшымі ўдарнікамі. Праўленьне разам з комсамольскім актывам займалася гэтым пытаньнем. Лепшымі ўдарнікамі прызнаны, як ужо гаварылася на сходзе, нас упяцера: Сьвірыдаў—працаваў амаль што без выхадных у час сяўбы і ўборкі. мае 176 працадзён; Хамякоў Улас—ён прышоў да нас пазьней, але працаваў яз ніводнага пропуску і ня браў выходных; Берагейка Каця—мае 171 працадзён Вось тыя, якія колькасна і якасна выконвалі працу і былі актыўнымі дапаможнікамі ў правядзеньні зьдзельшчыны. Праўленьне вызначыла прэміі: Сьвірыдаву рубашку і пару ботаў, Хамякову Уласу—пару ботаў, Берагэйка Каці—чаравікі і бумазэйную сукенку.

— Правільна праўленне падышло!..—крыкнуў нехта, чым спыніў Мірона.

— Правільна!..—пасыпаліся густыя воплескі.

— Правяраючы працадні, праўленьне парашыла паказаць „адваротных ударнікаў“, якія зьніжаюць нам дысцыпліну, неахайна адносяцца да працы і выконваюць яе з вялікім спазьненьнем.

— Ведаем іх,—не дачакаўшыся крычала комсамолка Надзя.

— Прыкладам можа быць Пятроўскі: мае 24 працоўныя дні, да яго можна дадаць Карпінскую—26, Юрку Севасьцеева—31, Зосю Кравец—33.

— Ганьба ім, на чорную дошку!—хваляваўся Рыгор.

— Выгнаць іх з колгасу,—патрабавалі другія.

— У газэту аб іх напісаць,—гаварылі некаторыя.

Старшыня працягваў далей сход. Для Уласа было гэта ўнеспадзеўкі.

Ён адразу адчуў у сябе нялоўка. Потым думкі падмацаваліся ўзьнятым настроем. Улас адчуў у жылах магутны разгон.

— Слова мне—першым узяў Павал.—Вітаць нам сёньня трэба ўдарнікаў, а асабліва такіх як Улас. Ён прышоў у колгас несьвядомым, нават быў усёй маемасьці не абагуліў.

— Праўду Павал кажа...—гудзеў сход, пляскаючы ў далоні.

— Апанас, давай мне сказаць,—зьвярнуўся Юрка да старшыні сходу

— Ну, давай.

— У мяне прапанова: не прэміяваць Уласа, бо ён зразу калі ішоў у колгас, не абагуліў калёс і хамута, ён—вораг колектывізацыі.

— Гэта цябе—абібока!—разам перабілі некалькі га асоў.

Калі сход скончыўся, да Арыны падышоў Павал. Ветліва ўзяў яе за плечы.

— Ты, Арынка, напішы ў нашу насьценгазэту пра сёньнешні сход. Напішы, каго прэміявалі і каго паставілі вывесіць на чорную дошку.

— Абавязкова напішу.

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА № 236 (1505)

КОМСАМОЛІЯ—НА АВАНПОСТЫ ШЭФСТВА НАД САВАПАРАТАМ

Гэтымі днямі ў партыйна-савецкім друку за подпісамі сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча, старшыні ЦКК КП(б)Б тав. Калініна і старшыні Ц ПСБ т. Кавалёва зьмешчан дырэктыўны ліст да ўсіх ГК, РК, ячэек КП(б)Б, ЦП саюзаў, райпроф саветаў і фабзаўкома, аб чарговых задачах прыцягненьня рабочых мас да ўдзелу ў рабоце савецкага апарату, не адрываючы іх ад вытворчасьці.

Гэты ліст мае выключнае політычнае значэньне. Рашаючыя посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва і ў зьвязку з гэтым, узросшая політычная актыўнасьць працоўных, стварылі ўсе ўмовы для рэалізацыі аднаго з важнейшых пунктаў праграмы УсеКП(б): „паступовага ўцягнення ўсяго працоўнага насельніцтва ў кіраўніцтва дзяржавай".

За апошні час, як падкрэсьлена ў лісьце, масавы рух рабочых, які разгарнуўся ў БССР пад кіраўніцтвам органаў КК РСІ, па ўзмацненьню штодзённага пролетарскага кантролю над работай савецкага апарату і непасрэднага выконваньня рабочымі раду дзяржаўных функцый (соцсумяшчальнікі, грамадзкія інспэктары, члены сэкцыі саветаў), мае рад посьпехаў.

Больш 400 тысяч працоўных прынялі ўдзел у чыстцы і праверцы савецкага апарату, у стварэньні рабочага актыву вакол працы розных наркоматаў усё гэта сьведчыць пролетарскага кантролю над савецкім апаратам.

Першыя крокі соцсумяшчэньня далі зусім конкрэтныя і станоўчыя вынікі. Мы маем рад фактаў у Менску, Віцебску, Гомелю, калі рабочыя соцсумяшчальнікі паказваюць лепшыя ўзоры работы ў розных савецкіх установах.

Аднак, у лісьце падкрэсьліваецца, што пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) „аб арганізацыі кантролю зьнізу і рабочым шэфстве ў БССР" да гэтага часу поўнасьцю ня выканана. Большасьць партыйна-комсамольскіх і профэсыянальных організацый да гэтага часу недапушчальна адносяцца да шэфства над савапаратам.

У радзе месц шэфства заводаў і фабрык над савецкімі ўстановамі ня ідзе далей урачыстых вечароў, абяцаньняў і пасяджэньняў.

Друк як цэнтральны, так асабліва мясцовы, не ўдзяляе дастатковай увагі наладжваньню шэфства, соцсумяшчэньню, масавай рабоце саветаў, організацыі дэпутацкіх груп і г. д.

Нельга не адзначыць той факт, што прыход у апарат новых атрадаў ударнікаў ад варштатаў часьцяком натыкаецца на ўпартае супраціўленьне клясавага ворага: бюро рата, чыноўніка, опортуністага. Клясава-варожыя вылазкі ня ўсюды атрымалі належны адпор ад кіраўнікоў установаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый на мясцох.

У лісьце падкрэсьліваецца, што гарадзкія і сельскія саветы, яшчэ не перабудавалі формы і мэтоды сваёй работы і не забясьпечылі непасрэднага ўдзелу дзесяткаў тысяч працоўных у рабоце савецкага апарату.

Выходзячы з гэтага, ЦК, ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ запрапанавалі ўсім партыйным і профсаюзным організацыям узмацніць штодзеннае кіраўніцтва работай па прыцягненьню шырокіх працоўных мас да непасрэднага ўдзелу ў савецкім апарапе, не адрываючы іх ад вытворчасьці

У лісьце вызначаны напрамкі шэфства над савецкім апаратам разгортваньне соцсумяшчэньня, перабудова масавай працы саветаў, організацыя рабочых і дэпутацкіх груп, абраньне паасобных катэгорый савецкіх работнікаў, уцягненьне работніц і колгасьніц у работу дзяржапарату і г. д.

Партыйна-комсамольскія і профсаюзныя організацыі павінны прыняць усе захады, каб выканаць гэтую важнейшую партыйную дырэктыву.

Парткаміт-ты і ячэйкі КП(б)Б павінны асабліва пільна сачыць за тым, каб не дапусьціць скажэньняў і дзелянцтва ў гэтай рабоце, паднімаючы яе ўвесь час на належную політычную вышыню".

„Комсамольскія організацыі могуць і павінны адыграць вельмі важную ролю ў барацьбе за ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы." Ячэйкі павінны заняцца вылучэньнем з ліку лепшых ударнікаў—рабочай моладзі соцсумяшчальнікаў.

Комсамольскія ячэйкі, якія паказваюць сапраўдныя ўзоры па шэфству над савецкім апаратам павінны ўзяць на буксір ячэйкі тых фабрык і заводаў, якія адстаюць.

Асабліва вялікія задачы паўстаюць перад атрадамі „лёгкай кавалерыі". Трэба яшчэ больш узмацніць барацьбу з бюрократызмам у савецкім апарапе, уцягнуць у атрады шырокія масы комсамольцаў і рабочай моладзі.

Райкомы і ячэйкі ЛКСМБ павінны зараз-жа выпрацаваць конкрэтныя пляны свайго ўдзелу ў рабоце па шэфству над савецкім апаратам.

Асабліва вялікая адказнасьць кладзецца на цэнтральны і нізавы друк.

Цэнтральны друк павінен стаць в жнейшым організатарам і штурхачом ва ўсёй гэтай рабоце.

Шматтыражкі і насьценгазэты павінны шырока асьвятляць практыку свайго прадпрыемства і ўстановы ў галіне шэфства, соцсумяшчэньня, работы дэпутатаў саветаў і дэпутацкіх груп.

Гэты дырэктыўны ліст а таксама пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) ад 19 жніўня павінны быць абгавораны на масавых рабочых сходах сходах партыйных і комсамольскіх ячэек, нарадах шэфактыву і соцсумяшчальнікаў.

На гэтых сходах трэба намеціць далейшыя мерапрыемствы па барацьбе з бюрократызмам і ўцягненьні новых колаў працоўных у непасрэдную работу савецкага апарату.

Б-к.

Забясьпечыць актыўны удзел комсамольцаў у справаздачнай кампаніі саветаў

З пастановы сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб ўдзеле комсамольскай організацыі у справаздачнай кампаніі саветаў

Наступаючая з 10 кастрычніка справаздачная кампанія саветаў мае вялізарнае політычнае значэньне. Гэтая кампанія павінна яшчэ больш узьняць ролю саветаў, як праваднікоў і барацьбітоў за генеральную лінію партыі, як органу пролетарскай дыктатуры.

Выходзячы з гэтага, сэкратарыят ЦК ЛКСМБ абавязвае ГК і РК ЛКСМБ мобілізаваць масу комсамольцаў, беспартыйнай працоўнай моладзі на забясьпечаньне іх удзелу ў гэтай кампаніі.

1. У час правядзеньня масавага агляду дзейнасьці саветаў (з 10 па 20 кастрычніка) стварыць спэцыяльныя комсамольскія брыгады па праверцы працы асобных сэкцый і саветаў. Асноўную работу брыгад сконцэнтраваць на праверцы і дапамозе гарсаветам у выкананьні прамфінпляну і за выкананьне дырэктыў чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб разгортваньні гарадзкой гаспадаркі. Праверыць, як выкананы наказы, дадзеныя абіральнікамі.

2. Правесьці адчыненыя комсамольскія сходы, на якіх абгаварыць пытаньне аб справаздачнай кампаніі саветаў. Заслухаць на сходах справаздачы комсамольцаў — членаў саветаў, ня спраўдзіўшых сябе на працы — адклікаць. Замест іх вылучыць лепшых актыўных комсамольцаў. Прыцягнуць шырокія колы беспартыйнай працоўнай моладзі на сходы.

3. Праверыць, як выканана рашэньне ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 300 комсамольцаў на працу у якасьці сэкратароў сельсаветаў і ў час справаздачнай кампаніі забясьпечыць скончэньне мобілізацыі.

4. Абавязаць гаркомы і райкомы КСМ у час справаздачнай кампаніі саветаў выступіць з конкрэтнымі мерапрыемствамі па узмацненьню ўдзелу комсамольцаў у барацьбе з беспрытульнасьцю і выкананьню дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб школе.

5. Справаздачная кампанія саветаў супадае з часам капаньня бульбы. Гэта абавязвае ўсе ГК і РК організаваць суботнікі па выбарцы бульбы. К справаздачам саветаў прысьвяціць організацыю комсамольскіх чырвоных абозаў, даставіць іх на чыгуначныя станцыі для адпраўкі ў рабочыя цэнтры.

6. ГК і РК распрацаваць рад конкрэтных масавых мерапрыемстваў (агітпаходы, вечары гутаркі і інш.) па растлумачэньню насельніцтву значэньня гэтай кампаніі і прыцягненьню іх да актыўнага ўдзелу ў ёй, шырока разгарнуўшы крытыку і самакрытыку вакол працы саветаў.

7. Абавязаць ГК і РК забясьпечыць 100 проц. ўдзел комсамольскай організацыі на справаздачных сходах і актыўны ўдзел у іх працы.


8. Гаркомы і райкомы разам з сельсаветамі павінны забясьпечыць 100 проц. ўдзел на справаздачных сходах саветаў жаночых і хатніх гаспадынь, дзеля гэтага неабходна на час сходаў арганізаваць дзіцячыя пляцоўкі, выкарыстаўшы для догляду за дзецьмі комсамолак і старэйшых піянераў.

9. Прапанаваць ГК і РК ЛКСМБ інфармаваць ЦК аб ходзе ўдзелу і мерапрыемствах у справаздачнай кампаніі.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ **Гуткін.**

12 кастрычніка, а 20 гадзіне

Усесаюзная пераклічка юнкораўскіх пастоў



Праверце спраўнасьць радыёпрыёмнікаў!

Рыхтуйцеся слухаць радыё-апавяданьне, організаванае „Комсамольскаю Праўдай", аб сусьветным гіганце Урала Кузбасе.

Слухайце рапарт комсамоліі Аршанскага чыгуначнага вузла аб яе ўдзеле ў будаўніцтве новай мэталюргічнай базы ў СССР—Урала-Кузбасу. Рапарт ударнікаў восьмай комсамольскай істужкі „Сьцягу індустрыялізацыі", „Комунаркі", Бабруйскага заводу імя Сталіна, комбінату імя КІМ, Асінторпу і Магвалакнабуду—аб іх перамогах на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Чакаем рапартоў аб падрыхтаванасьці да радыё пераклічкі.

„Чырвоная Зьмена" Беладдзяленьне газ. „Комсомольской Правды"

518-ці—добраякасныя кадры

За узорную працу ФЗВ

Непадрыхтаванасьць стварае прарывы

Пры значных дасягненьнях у працы Віцебскага буд. ФЗВ ёсьць шмат і недахопаў, якія ставяць навучальны год пад пагрозу зрыву.

Памяшканьняў для заняткаў яшчэ не падрыхтавана. Укомплектаваньне ФЗВ настаўнікамі не закончана. Цэхі пастаўлены ў вельмі дрэнныя ўмовы. Сьлясарны цэх, які працуе ў кузьні Белдзяржбуду, ня мае патрэбных інструментаў і матэр'ялаў. Памяшканьне майстэрні цеснае. У сьлесарным і апальным цэхах часта бываюць прастоі з-за недахопу матэр'ялаў. Вучні скарыстоўваюцца на чорнай рабоце.

Дрэнная пастаноўка працы адбіваецца адмоўна і на працыдысцыпліне. Нярэдка вучні пакідаюць працу, каб паабедаць да званка. Інструктары позьняцца на працу, пакідаюць вучняў без работы, адным словам адносяцца да справы па-казённаму.

У сталярным цэху няма асьвятленьня цык другая зьмена пакідае працу на гадзіну-паўтары раней.

Майстэрні ў без аспадарчым стане. Шыбы павыбіваны. Як прыйдуць халады, працаваць будзе немагчыма.

Надзвычай слаба наладжана грамадзкая праца. Фонд прэміяваньня лепшых вучняў марнуецца; не знаходзяць [illegible] ўдарнікаў.

Дагэтуль вучні не ўключаюцца ў спаборніцтва. Віцебскі гарком ЛКСМБ і газ. „Віцебскі пролетары" конкурс на лепшы ФЗВ.

Патрэбны рашучыя захады, каб палепшыць забясьпечаньне фабзавучнікаў. Пераважная большасьць фабзавучнікаў ня мае гарачага сьнеданьня. Сталоўка ФЗВ знаходзіцца ў антысанітарным стане. Якасьць абеду ніжэй, чым дрэнная.

Закрыты размеркавальнік забясьпечвае фабзавучнікаў у апошнюю чаргу.

Коопэрацыйныя організацыі павінны таксама ўключыцца ў конкурс і паклапаціцца аб лепшым забясьпечаньні фабзавучу.

Брыгада „Ч. З."

Усыскін, Ваўчон

Прагнаць з сельсавету

Сэкратар Турчаўскага сельсавету (Бабруйскі раён) Падольская Вольга добра ведаючы белмову, злосна ўхіляецца ад яе ўжываньня.

Падольская разважае так:—Я не хочу разговаривать на этом мужицком языке".

Вялікадзяржаўнай шовіністцы няма месца ў сельсавеце. **Рыг. М.**

Падрыхтавацца да новага торпсэзону

Гэтымі днямі адбылася ўсебеларуская нарада сэкратароў комсамольскіх ячэек торпзаводаў якая падвяла вынікі работы комсамолу торпрамысловасьці за мінулы сэзон.

Выкананьне сэзоннага пляну торп здабычы на 55 проц. яскрава сьведчыць аб тым, што гаспадарчыя, профсаюзныя і комсамольскія організацыі не перабудавалі сваёй работы у адпаведнасьці з ўказаньнямі тав. Сталіна.

Сама організацыйная пабудова комсамольскай работы ня спрыяла мобілізацыі мас комсамольцаў і рабочай моладзі на выкананьне прамфінпляну. На буйнейшых заводах, як Асінторп, „Шлях соцыялізму" і інш. работа ячэек была пабудавана па пасёлковаму прынцыпу. Ячэйкі стварыліся на пасёлках, а не на машынах і агрэгатах. Гэта не давала магчымасьці кожнай ячэйцы займацца адным з об'ектаў вытворчай работы, з аднаго боку, а з другога—адбівалася на разгортваньні вялікай масавай работы па уцягваньню рабочай моладзі у комсамол. У выніку рост комсамолу на торпзаводах зусім недастатковы.

Комсамол Беларусі павінен быў мобілізаваць на торпзаводы 2000 комсамольцаў. Ня глядзячы на зусім выразныя дырэктывы бюро ЦК ЛКСМБ і трэцяга кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ, аб мобілізацыі на сталую працу, большасьць раённых комсамольскіх організацый ня выканалі кантрольных лічбаў мобілізацыі. У лепшым выпадку мобілізаваныя комсамольцы працавалі два-тры месяцы і адклікаліся назад, тады як павінны быць замацаваны за торпзаводамі. Нават былі такія выпадкі, калі паасобныя райкомы, як напрыклад Талечынскі, [illegible] адклікаюць комсамольцаў, мобілізаваных на торпзаводы, а Камарынскі райком умудрыўся выключыць з комсамолу добраволька, які працаваў на торпзаводзе.

Надзвычай дрэнна стаяла справа з партыйным кіраўніцтвам комсамольскіх ячэек. Ініцыятыва комсамольцаў звычайна не падхаплялася. На Асінторпе былі выпадкі зацiску самакрытыкі сэкратаром партыйнага колектыву. Былі факты неразуменьня партыйкіраўніцтвам сутнасьці гаспадарчага разрахунку і прэміяльна-прогрэсыўнай зьдзельшчыны, якая ўводзілася па ініцыятыве комсамольскай організацыі.

Усё гэта бязумоўна адбівалася на організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Так на Асінторпе, брыгада Суславай паказала сапраўды бальшавіцкія ўзоры працы, была прэміявана, але прэмію атрымала праз 2 месяцы. Гэроічныя прыклады работы комсамольскіх брыгад не пераносіліся на ўсе іншыя, вопыт лепшых не рабіўся набыткам усіх заводаў

Дрэнныя бытавыя ўмовы, адсутнасьць культурна-масавай працы, наяўнасьць абязьлічкі і ўраўнілаўкі, слабая барацьба з імі ўсіх організацый, асабліва комсамольскіх, прывялі да таго, што за выключэньнем нязначнай колькасьці заводаў („Чырвоны тарпянік", „Ленінскі шлях", „Закрашынскі мох") ні адзін завод прамфінпляну ня выканаў.

На рабоце торпзаводаў у значнай меры адбівалася дрэннае опэрацыйнае кіраўніцтва Белторпу. Замест дапамагчы заводу ўкараніць гаспадарчы разрахунак, прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну, зьнішчыць абязьлічку, правільна організаваць працу, працаўнікі Белторпу займаліся кіраўніцтвам „наогул". Гэта пераносілася на гаспадарчае кіраўніцтва заводаў. Давоі падаць такі факт. Дырэктар Асінторпу тав. БЕЛАВУСАЎ быў некалькі дзён у Менску на нарадзе, а на заводзе ня было адказнага таварыша за ўсю работу, праца амаль спынілася.

Ня лепш і з работай мясцовых профорганізацый. Некаторыя торпкомы займаліся толькі зборам членскіх узносаў. Організацыя працы, мобілізацыя ўвагі рабочых на ліквідацыю прарываў, палепшаньне грамадзкага харчаваньня і культбытавых умоў—усё гэта праходзіла міма мясцовых профпрацаўнікоў.

Такім чынам дрэнная падрыхтоўка да пачатку сэзону, няўменьне правільна організаваць працу ў час сэзону, дрэннае скарыстаньне мэханізмаў прывяло да зрыву прамфінпляну аднэй з буйнейшых галін прамысловасьці Беларусі—тарпянай.

Зараз на балотах знаходзяцца дзесяткі тон торпу; высушыць іх і даставіць спажыўцу—важнейшая задача данага пэрыоду.

На падставе перабудовы працы комсамольскіх організацый, на падставе актыўнай дапамогі ўсёй грамадзкасьці, і асабліва комсамольскіх організацый заводаў, спажываючых торп—патрэбна вывезьці ўвесь торп, не пакінуўшы ніводнае цагліны на балоце. Гэта зараз важнейшая задача комсамольскай організацыі Беларусі.

У чацьвертым, апошнім годзе пяцігодкі, шахты тарпянага Донбасу павінны даць 2 мільёны тон торпу. Неабходнасьць выканаць гэту программу стане зусім зразумелай, калі мы ўлічым, што па пастанове ЦК КП(б)Б у 1932 годзе патрэбна перавесьці на тарпяны апал усю прамысловасьць БССР.

Нарада сэкратароў комсамольскіх ячэек торпзаводаў намеціла рад мерапрыемстваў на падрыхтоўцы да наступнага сэзону.

Па-першае, неабходна канчаткова замацаваць мобілізаваных комсамольцаў на сталую працу ў торпрамысловасьці. Райкомы ЛКСМБ павінны ў бліжэйшы час выканаць кантрольныя лічбы мобілізацыі.

Работа комсамольскай ячэйкі торпзаводу на зімовы час побач з організацыяй вялікай работы сярод застаўшыхся на заводзе рабочых, па іх замацаваньню і далейшай кваліфікацыі, павінна быць перанесена ў колгасы, вёскі, дзе жывуць рабочыя—сэзоньнікі.

Організаваць работу ў хатах-чытальнях такім чынам, каб давесьці да кожнага рабочага тарпяніка плян наступнага сэзону, уцягнуць на падставе індывідуальнага адбору, усю рабочабатрацкую моладзь у комсамол, організаваць тэхнічнае навучаньне кожнага тарпяніка—важнейшая задача комсамольскай ячэйкі.

Правесьці вялікую працу па складаньню дагавароў на адыходніцтва з прымацаванымі колгасамі, дапамагчы гэтым колгасам у выкананьні гаспадарчых задач—другая важнейшая задача.

Вопыт мінулага сэзону паказаў, што асноўным прарывам у невыкананьні прамфінпляну зьяўляецца недастатковая падрыхтоўка мэханізмаў да сэзону. Таму, комсамольскай ячэйцы патрэбна зараз-жа павесьці барацьбу за сваячасовую дастаўку мэханізмаў на заводы, організуючы пасты на заводах, выпрабляючых торпабсталяваньне наладжваючы цесную сувязь з комсамольскімі організацыямі гэтых заводаў, даючы узаемныя абавязацельствы і г. д.

Зімовы час скарыстаць для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў з комсамольцаў і рабочай моладзі. Організаваць спэцыяльныя гурткі, курсы пад кіраўніцтвам вопытных спэцыялістых-тарпявікаў.

Устанавіць комсамольскі кантроль і дапамогу за ацяпленьнем і будаўніцтвам новых баракаў—важнейшая задача.

Зьвязаўшыся з комсамольскімі ячэйкамі коопэрацыйных організацый, трэба зараз-жа дабіцца сваячасовага завозу продуктаў грамадзкага харчаваньня на торпзаводы.

Наглядаецца, што паасобныя заводы („Гэрой працы" „Чырвоная зорка"), якія спажываюць торп, проста ігноруюць дырэктывы вышэйшых органаў аб ужываньні фрэзэрнага торпу. Комсамольскія ячэйкі торпзаводу павінны дабіцца пераабсталяваньня топак пад фрэзэрны торп. Ячэйкі ЛКСМБ спажываючых заводаў павінны зьявіцца галоўным штурхачом у гэтым напрамку.

Усю гэту працу можна выканаць толькі пры тэй умове, калі мы добра наладзім работу мясцовага друку, створым насьценгазэту на кожным ўвучастку, у кожным колгасе, у кожнай хаце-чытальні, згрупуем вакол газэт усю грамадзкасьць, поўнасьцю рэалізуем пастанову другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Комсамольскія ячэйкі павінны стаць ініцыятарамі ў організацыі насьценгазэт, зрабіць іх сапраўднымі барацьбітамі за падрыхтоўку да сэзону апошняга году пяцігодкі.

Толькі пры рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, пры організацыі сапраўднай бальшавіцкай падрыхтоўкі да сустрэчы новага сэзону мы здолеем выканаць пляны чацьвертага году.

Пастановы ЦК КП(б) СНК, рабсельваенкораўскага зьезду, кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ і апошняй нарады сэкратароў комсамольскіх ячэек торпзаводаў павінны стаць праграмаю дзейнасьц для кожнай комсамольскай ячэйкі торпазаводаў, для кожнай комсамольскай ячэйкі прадпрыемстваў спажываючых торп

Быхаўскі, Каганская.

„Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача“ (Сталін)

Рэйд юнкораў—ударнікаў „Чырвонай Зьмены“

Указаньні Сталіна—програма дзейнасьці

На заводзе імя Варашылава ўзяліся па-бальшавіцку за ажыцьцяўленьне ўказаньняў Сталіна аб быце

Раўняцца па варашылаўцах. Дабіцца палепшаньня бытавых умоў рабочых

Указаньні Сталіна „палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача“ павінна стаць програмай дзейнасьці комсамолу.

Комсамольскі колектыў заводу імя Варашылава па-ўдарнаму ўзяўся за ажыцьцяўленьне ўказаньня тав. Сталіна. Заводзкія організацыі пры дапамозе комсамольскага колектыву пературылі сталоўку ў сапраўдны цэх прадпрыемства, палепшылі бытавыя ўмовы рабочых, якія жывуць у інтэрнаце, організавалі заводзкую абутковую майстэрню і цырульню.

Але побач з дасягненьнямі гэтага заводу, рэйд ударнікаў „Чырвонай зьмены“ высьвятліў, што рад колектываў („Полымя рэволюцыі,“ „ДА“, „Комунар“) указаньне Сталіна ў галіне палепшаньня бытавых умоў рабочых не зрабіў яшчэ програмай штодзённай работы колектываў, ня ўключыў у плян работы комсамолу.

Сёмы маршрут сталінскай пуцёўкі „за соцыялістычны быт“ падкрэсьлівае, што „краіна, якая пасьпяхова будуе соцыялізм, павінна быць высокакультурнай. Змагаючыся за палепшаньне культурна бытавых умоў, ты практычна рэалізуеш лёзунг нашай партыі:—„за культурную рэволюцыю“.

Комсамольскім організацыям неабходна зараз-жа ўзяцца за ажыцьцяўленьне ўказаньняў Сталіна аб быце, за рэалізацыю сёмага маршруту сталінскай пуцёўкі.

Вы дрэнна змагаецеся за новы быт

Комсамольскі колектыў „Полымя рэволюцыі“ павінен узяцца за палепшаньне бытавых умоў рабочых,

Пасьля таго, як колектыў ЛКСМБ заводу „Полымя рэволюцыі“ прапрацаваў прамову Сталіна, забясьпечаньне сталоўкі харчамі значна палепшылася.

Але забясьпечаньне рабочых кватэрамі і палепшаньне бытавых умоў усе яшчэ на апошнім месцы.

Большая палова несямейных рабочых жывуць па 20 і болей чалавек у вагоне.

Для рабочых будуецца інтэрнат, але калі яго скончаць невядома.

Колектывам ЛКСМБ організавана бытавая камуна з 20 чал. рабочых-комсамольцаў. Але памяшканьня не знашлі і комуна значыцца толькі на паперы.

Заводзкія організацыі не клапоцяцца аб тым, каб у бліжэйшы час закончыць інтэрнат.

Пункт прамовы Сталіна аб палепшаньні бытавых умоў рабочых ня стаў яшчэ програмаю дзейнасьці колектыву ЛКСМБ.

Колектыў ЛКСМБ „Полымя рэволюцыі“ павінен зараз-жа ўзяць пад свой непасрэдны кантроль будаўніцтва інтэрнату, расставіць кантрольныя пасты, якія-б сачылі за ходам будаўніцтва інтэрнату.

Неабходна, каб прамова Сталіна і ў галіне палепшаньня бытавых умоў рабочых зьяўлялася штодзённай програмай комсамольскай работы колектыву.

..Аб лёсе іншых колектыў ня ведае

Колектыў ЛКСМБ заводу „Дрэваапрацоўшчык“ яшчэ ня ўзяўся за пературэньне ў жыцьцё указаньняў т. Сталіна па палепшаньню бытавых умоў рабочых свайго заводу.

На заводзе каля 600 рабочых. І толькі невялікая частка жыве ў жактах, блізу заводу. Кватэры-ж іншых параскіданы па ўсім горадзе.

З кватэрамі для новапрыбыўшых рабочых ня лепш. 60 чалавек улетку зьмяшчалася ў школе. Цяпер 16 перайшло ў барак, 8 зьмясьціліся ў клюбе, а аб лёсе іншых колектыў ня ведае.

У апошні час пачалі будаваць другі барак на 22 асобы. але скончаць толькі к зіме, Маюць на мэце пабудаваць 3-ці барак.

У апошні час дабіліся зруху ў харчаваньні рабочых; палепшылася якасьць абедаў. Рабочыя, занятыя на цяжкой працы, атрымоўваюць падвойныя порцыі. Палепшыліся і санітарна-гігіенічныя ўмовы сталоўкі.

Але ў працы сталоўкі ёсьць і недахопы. Памяшканьне цеснае. Новую сталоўку прызначылі былі адчыніць да кастрычніка, але ацягнулі яшчэ на 2 месяцы.

Ня выконваецца санмінімум. Па заводзкім двары параскіданы адкіды драўніцы. утыль-жалеза, шкло. Бывае, што памыі са сталоўкі выліваюць на двор.

Зараз колектыву ЛКСМБ „ДА“ трэба неадкладна ўзяцца за палепшаньне бытавых умоў рабочых. увёўшы гэта пытаньне ў сваю штодзённую працу.

Бытавая комуна 45 павінна жыць

Увесну гэтага году з ударнай комсамольскай брыгады ў 45 чал. на заводзе „Комунар“ (Менск) была організавана вытворча-бытавая комуна.

Па нядбальству заўкому і колектыву ЛКСМБ комуна апынулася пад пагрозай развалу. Разьмясьціўшы комунараў па пакоях, заўком не паклапаціўся забясьпечыць пакоі сьвятлом, вадою, ложкамі.

Да гэтага часу комунары сьпяць на падлозе, дзе шмат сьмецьця і бруду.

Заўком адмовіўся адпусьціць сродкі на праводку электрычнасьці і вады.

Колектыў ЛКСМБ „Комунара“ павінен зрабіць усё неабходнае, каб не дапусьціць развалу комуны „45“. Станові шчам бытавой комуны павінны зацікавіцца органам РСІ.

На дасягнутым ня спыняцца

Комсамольскі колектыў заводу імя Варашылава стаў на шлях палепшаньня бытавых умоў рабочых. На заводзе організаваны адзін інтэрнат на 30 асоб.

Каб пазбавіцца кватэрных цяжкасьцяй, завод пачаў будаўніцтва этокватэрнага дому пад кватэры лепшым ударнікам і інтэрнату на 40 асоб.

Будаўніцтва павінна быць закончана к канцу 1931 году.

Для кантролю працы ларкоў і буфэту колектыў ЛКСМБ організоўвае комсамольскія пасты.

На заводзе адчынена абутковая майстэрня для рамонту абутку рабочых і цырульня.

Але разам з добрымі пачынаньнямі ў палепшаньне бытавых умоў рабочых, комсамольскі колектыў зусім мала ўвагі зьвярнуў на выкананьне санмінімуму.

Заводзкі двор завідан розным сьмецьцем.

—Ні праехаць, ні прайсьці,—гавораць рабочыя,

Комсамольскаму колектыву неабходна з яшчэ большай энэргіяй узяцца за ліквідацыю гэтых недахопаў.

Удзельнікі рэйду па праверцы стану палепшаньня культурна-бытавых умоў рабочых: Кавалевіч, Граковіч, Тазоўка, Варэнік, Тарашкевіч і Яфрэмаў

ДЗЕ КІРАЎНІЦТВА У БАКУ...

там самацёк у працы насьценгазэт і ў кіраўніцтве юнкоррухам

Комсамольскія організацыі шклозаводаў „Домбаля“ і „Кастрычніка“ ігноруюць пастанову другога зьезду рабселькораў аб узмацненьні кіраўніцтва юнкорамі

Партыйна-комсамольскія організацыі, забясьпечыўшы штодзённае опэрацыйнае кіраўніцтва працай насьценгазэт і шматтыражак, дадуць ім магчымасьць стаць сапраўднымі змагарамі за выкананьне гаспадарча-політычных задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад усёй рабочаю клясай Савецкага Саюзу.

Аб гэтым яскрава сказаў другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў, аб гэтым гавораць пастановы партыі аб перабудове рабселькораўскай работы. Здавалася-б, што гэтыя пастановы зусім зразумелы і яскравы.

На вялікі жаль, частка раённых, а таксама вытворчых і саўгасна-колгасных партыйна-комсамольскіх колектываў ўпарта не жадаюць узяцца за выкананьне гэтых пастаноў.

Комсамольскія організацыі павінны запамятаць, што вымеркамі іх працы будзе таксама і праца цэхавых і заводзкіх насьценгазэт і шматтыражак і ўдзел у іх комсамольскай і беспартыйнай моладзі.

Чаму ня выходзіць шматтыражка?

(Шклозавод „Домбаль“ Нова-Барысаў)

Заводзкі друк „Домбаля“ ў сучасны момант знаходзіцца ў надзвычай дрэнным стане. Рэдактар шматтыражкі тав. Рэнар кінула працу і, відочна, нікому не перадала справы. Шматтыражка ня выходзіць ужо больш месяцу, тады як павінна выходзіць кожную пяцідзёнку. Пастанова грамадзкіх організацый аб тым. што цэхавыя насьценгазэты павінны выходзіць штодзённа. засталася на паперы. Цэхавыя пазьменныя насьценгазэты выходзяць раз у два тыдні а то і менш. Партыйна-комсамольскі колектыў яшчэ і на сёньня ня стаў пытаньня на сваіх пасяджэньнях аб тым, чаму спыніўся выхад шматтыражкі і хто ў гэтым вінаваты.

Мы пытаемся, калі-ж будуць праведзены ў жыцьцё пастановы партыі і 2-га зьезду рабселькораў.

Брыгадзір „Ч. З.“
Крутаўцоў

Стаўка на самацёк павінна быць біта

На шклозаводзе „Кастрычнік“ (Асіпавіцкі р-н) да гэтага часу не распрацаваны сярод рабочых ударнікаў пастановы другога зьезду рабселькораў. Частка рабочых ня ведае, калі адбыўся рабселькораўскі зьезд і чым ён характэрны.

На фабрыцы вялікі атрад рабкораў і юнкораў. Аднак ні партыйны, ні комсамольскі колектыў ніякай працы сярод іх не праводзіць. Насьценгазэты цэхаў і заводу зусім не працуюць. Рэдколегія таксама ня лічыць патрэбным наладзіць працу з рабкорамі. і мала аб іх ведае. Калі пытаешся ў адказнага рэдактара агульна-заводзкай газэты тав. Пчолкіна, колькі на заводзе рабюнкораў і якую працу вядзе сярод іх рэдколегія, дык ён гаворыць: „Бачыце, на гэта пытаньне мне цяжка адказаць, бо мяне нядаўна абралі на гэтую пасаду“ (забыўся, відаць, што ўжо мінула больш двух месяцаў).

На зьмешчаныя допісы ў насьценным друку ніхто не рэагуе, адпадае ахвота пісаць.

Партыйна-комсамольскі колектыў узяў опортуністычную стаўку на самацёк у разгортваньні рабюнкораўскага руху на заводзе і ў працы насьценгазэт.

Асіпавіцкі РК КП(б)Б павінен зацікавіцца тым, як праводзяцца ў жыцьцё пастановы партыі аб перабудове працы і кіраўніцтве рабюнкорухам і нізавым друкам.

Зьмітрок Вішнёвы

Наладжваем у колгасе насьценгазэту

Вучні Грэскае ШКМ (Слуцкі р-н) узялі на сябе абавязак стварыць насьценгазэту ў колгасе „Перамога“ і дапамагаць ёй у працы увесь навучальны год.

Заклікаем усе ШКМ раёну пасьледваць нашаму прыкладу, наладзіўшы выпуск і працу насьценгазэт ва ўсіх існуючых колгасах

Старшыня вучкому ШКМ
Траяноўскі

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

12 кастрычніка г. г, а 7-й гадзіне ўвечары у памяшканьні дому Комасьветы (уваход з вул. Энгельса—пакой 19) адбудзецца агульна-гарадзкая нарада ўсіх культпропаў, партколектываў, ячэек КПбБ, упаўнаважаных па партдруку і ўдарнікаў „Праўды“. Абвестка дня:

1. Даклад паўпрэда рэд. „Правда“ па БССР тав. Дорфмана аб рабоце паўпрэдзтва „Праўды“ і судаклад Менскага Газэтнага бюро аб ходзе работы па распаўсюджваньню „Праўды“ па Менску.

2 Бягучыя справы.

Усе культпропы, партупаўнаважныя і ўдарнікі „Праўды“ павінны зьявіцца на нараду без спазьненьня.

Культпроп Менгаркому КПбБ.

Адкрыт прыём

на аўтоманцёрнае аддзяленьне Бабруйскае школы Дарстройвучу на 40 асоб.

Прымацца будуць выключна скончыўшыя 7-годку, ад 16 да 18 гадоў, дзеці рабочых і рабочыя, выхаванцы дзетдамоў, колгасьнікі, батракі і беднякі.

Тэрмін навучаньня—2 гады. Вучні атрымліваюць пры ўступленьні ў школу зарпэнсію, якая паступова павялічваецца.

Прыежджыя з іншых гарадоў забясьпечваюцца інтэрнатам.

Да заяў прыкладаюцца наступныя дакуманты:

1) аб адукацыі, 2) аб соцыяльным становішчы і паходжаньні, 3) аб узросьце. 4) аб здароўі і 5) аб праве голасу.

Жанчын прымаецца 40 проц. Тэрмін падачы заяў; 13 кастрычніка г. г.

Да заяў прыкладаюцца маркі на 30 кап.

Адрас школы: Бабруйск, школа Дарстройвучу, рог Менскай і Кастрычнікавай.

Начальнік школы.

ОРГАНІЗУЕЦЦА ЎДАРНЫ ПАРАВОЗ ІМЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

ВОРША 8. (Па тэлефону ад выязной рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“) Шырока разгарнулася падрыхтоўка да пленуму ЦК КПбБ. Зараз організоўваецца ўдарны манэўровы паравоз імя „Чырвонай Зьмены“. Паравоз будуць абслугоўваць комсамольскія спараныя брыгады.

Організоўваецца рад паравозных брыгад, якія пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак.

Фіялкін.

12 кастрычніка 1931 г., роўна а 6-й гадзіне ўвечары (у памяшканьні ЦК ЛКСМБ—Карла Маркса, 3) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму ЦКК ЛКСМБ, на якое выклікаюцца наступныя таварышы: Мытнік П. М., Цьвірко А. К., Цюльга І., Бэрнштэйн, Кохна Н. С., Шнітман, Гіндзін Д. Л., Верабей М., Адынец З. П., Славікоўскі Я., Харытончык У. Р., Кантаровіч М., Баброў А., Бляхэр В. С., Падалек А. А., Прус, Шчурко М. А., Гладкі Н., Пятухоў, Ганестаў В. В.

Праезд за свой кошт

Адказны сэкратар ЦКК ЛКСМБ ЄКАБЛО

Стара-Барысаўскі Сьвінагадоўчы Тэхнікум

аб'яўляе прыём на 9-ці месячныя курсы тэхнікаў сьвінаводаў

Пачатак заняткаў 25 кастрычніка

Без іспытаў прымаюцца маючыя адукацыю не ніжэй 6 клясаў сямігодкі

Патрэбны дакуманты: аб соцстановішчы, праве голасу, аб узросьце, адукацыі і здароўі

Пажаданы рэкамэндацыі і камандыроўкі. Умовы вучобы: усім стыпэндыя 85 руб. і інтэрнат

Заявы падаваць: г. Барысаў, Стара-Барысаўскі с. г. тэхнікум

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

[illegible] № [illegible]